ГАЗЕТА З БЕЛАРУСІ

ГОЛАС РАДЗІМЫ

ВЫДАЕЦЦА З 1955 ГОДА ● NO.48 (3072) ● СУБОТА, 29 снежня, 2007

ШТОТЫДНЁВІК “ГОЛАС РАДЗІМЫ” МОЖНА ЧЫТАЦЬ У ІНТЭРНЭЦЕ: **WWW.GOLAS.BY**

Маршруты, якія ўзбагачаюць жыццё
Ансамбль беларускай песні “Світанак” незвычайным спосабам адзначае маршруты сваіх канцэртных паездак Стар. 2

Камендант Масквы Кузьма Сінілаў
Ураджэнец Лоеўшчыны прайшоў складаны, але цікавы і багаты на падзеі жыццёвы шлях Стар. 3

Адмысловы рэнесанс
Стар. 4

Віншаванні прыйшліся да спадобы

Ірына Цімохіна

У чэмпіянаце Польшчы па Калядных і Навагодніх віншаваннях вызначыўся пасол Беларусі ў гэтай краіне.

У Варшаве прайшоў сёмы адкрыты чэмпіянат Польшчы па Калядных і Навагодніх віншаваннях. У конкурсе прымалі ўдзел польскія дзеячы культуры, журналісты, члены Парламента, палітыкі, прадпрымальнікі. Арганізатарам конкурсу з’явіўся часопіс “Салідная фірма”. Першае месца на чэмпіянаце заняў рэдактар Польскага радыё Марэк Гасіньскі, другое месца — сенатар Анджэй Пэрсон. Трэцяе месца па выніках галасавання польскай грамадскасці заняў Пасол Беларусі ў Польшчы Павел Латушка. Чым крануў душы палякаў беларускі дыпламат? Пасол у сваім віншаванні з Калядамі і Новым 2008 годам удала, вобразна, а, галоўнае, даходліва акрэсліў блізкасць, глыбокія гістарычныя і культурныя сувязі беларускага і польскага народаў.

У якасці віншаванняў быў выкарыстаны ўрывак з паэмы Якуба Коласа “Новая зямля” (у перакладзе на польскую мову Чэслава Сэнюха), а таксама спецыяльна напісаны з гэтай нагоды верш на беларускай мове Сяргея Давідовіча-Зосіна “Віншаванні ад беларускай Амбасады”.

Конкурс асвятлялі вядучыя польскія тэлеканалы, радыёстанцыі і часопісы. Іх прадстаўнікам пасол расказаў аб традыцыях святкавання праваслаўных і каталіцкіх Калядаў, Новага года ў Беларусі.

Сустрэчы з гасціннасцю

Пастаўскі раён: легенда і сучаснасць

Кацярына Немаляева

Увогуле ў Пастаўскі раён Віцебскай вобласці едуць розныя турысты, нават з Кітая. А вось у дзень адкрыцця сядзібы прапрадзеда Дзеда Мароза ягонымі гасцямі сталі юныя жыхары Пастаў. Так, за тры гады існавання забаўляльнага праекта папулярнасць Зюзі Паазерскага перайшла межы Беларусі. У гэтым сезоне акрамя кітайскіх турыстаў пагасціць у казачнага персанажа вырашылі і суседзі з Расіі: некалькі груп у першыя дні студзеня прыедуць у сядзібу славянскага гаспадара холаду і марозу.

Цяперашні сезон Зюзя сустракае ў новай сядзібе — у вёсцы Азярцы, недалёка ад Пастаў. Пераезд Зюзі і яго сяброў — Завеі, бабы Напасці, Ледавіка і Агневіка — дазволіў стварыць больш камфортныя ўмовы для турыстаў. Гасцям паказваюць тэатралізаванае прадстаўленне, якое доўжыцца адну гадзіну і заўсёды праходзіць на свежым паветры. Героі стараславянскіх легенд не толькі расказваюць аб сваіх вясёлых прыгодах, але і прапаноўваюць мноства займальных гульняў, а таксама экскурсію па Пастаўскім краі.

Сам Зюзя частуе сваіх гасцей гарачай травяной гарбатай з самавара, які растопліваецца дрывамі, блінамі і пернікамі, выпечанымі па старадаўніх рэцэптах.

У сядзібе працуюць майстэрні ганчара і разьбяра па дрэву. Народныя ўмельцы не толькі на вачах у турыстаў вырабляюць сувеніры ад Зюзі, але і з задавальненнем навучаюць усіх жадаючых асновам свайго рамяства.

“Чорная панна Нясвіжа” ўразіла літоўцаў

У Вільнюсе з вялікім поспехам прайшоў спектакль Нацыянальнага акадэмічнага тэатра імя Янкі Купалы “Чорная панна Нясвіжа”

Валерыя Сямёнава

Гэта першыя гастролі тэатра ў Літве пасля амаль дзесяцігадовага перапынку. Спектакль па п’есе Аляксея Дударава, які прысвечаны гісторыі Вялікага княства Літоўскага, знайшоў водгук у літоўскага гледача, нягледзячы на тое, што са сцэны гучала беларуская мова. “Гэта зусім нечаканая трактоўка гістарычных фактаў, арыгінальная і вельмі прыгожая, — падзялілася ўражаннямі пасля спектакля каардынатар па культурных мерапрыемствах Нацыянальнага драматычнага тэатра Літвы Віола Вечэрскене. — Апладысменты гучалі доўга, гледачы адыходзілі з душэўным пад’ёмам. Нам спадабалася сцэнаграфія спектакля, незвычайна прыгожыя, багатыя касцюмы. Ігра артыстаў была цудоўнай, у прыватнасці, Святланы Зелянкоўскай у ролі Барбары Радзівіл. А яшчэ мы цяпер ведаем, што ў беларусаў ёсць зорка — выдатны артыст і ён жа дырэктар тэатра Мікалай Кірычэнка. Спектакль атрымаўся, бо гісторыя — гэта тое, што нас аб’ядноўвае, гэта наша агульная гісторыя”.

На спектаклі, што быў прымеркаваны да 15-годдзя ўсталявання дыпламатычных адносін Беларусі і Літвы, прысутнічалі прадстаўнікі беларускай дыяспары ў Літве, прадстаўнікі Сойма і ўрада Літвы, дыпламаты.

Купалаўцы прапанавалі таксама літоўскай публіцы спектакль “С. В.” па матывах камедыі Антона Чэхава “Вішнёвы сад”.

ВЕСТКІ

Гарантыі атрыманы

Васіль Міхальчук

Рэспубліка Беларусь заключыла асноўную дамову з Дзіцячым фондам ААН.

Дамова падпісана ў штабкватэры Дзіцячага фонда ААН у Нью-Йорку намеснікам кіраўніка Адміністрацыі Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь Наталляй Пяткевіч і выканаўчым дырэктарам фонда Эн Венеман. Заключэнне дамовы скіравана на стварэнне неабходных прававых умоў і гарантый для эфектыўнай дзейнасці ў Беларусі Дзіцячага фонда ААН і паспяховай рэалізацыі праграм і праектаў галоўнага міжнароднага органа па абароне правоў і інтарэсаў дзяцей.

Навагодні рубеж у Белавежскай пушчы

“Загадваю: заступіць на абарону навагодніх межаў. Галоўная задача — забяспечыць бесперашкодны пераход Новым 2008 годам дзяржаўнай мяжы з Усходу на Захад”, — такі незвычайны загад аддаў Дзед Мароз пагранічнаму нараду ў сваёй рэзідэнцыі, куды прыехалі на экскурсію дзеці з сем’яў пагранічнікаў і вучні Станькаўскай школы-інтэрната.

Варта адзначыць, што рэзідэнцыя Дзеда Мароза (у Белавежскай пушчы) знаходзіцца ў памежнай зоне, а таму ён сам, па сутнасці, з’яўляецца пагранічнікам. Ва ўрачыстай абстаноўцы старшыня Дзяржпагранкамітэта Ігар Рачкоўскі ўручыў Дзеду Марозу зялёны берэт і дыплом прысвячэння яго ў пагранічнікі. У самой рэзідэнцыі ўсталявалі сімвалічную навагоднюю мяжу — памежны слуп з нумарам 2008, на які дзеці прыклеілі загадзя падрыхтаваныя сняжынкі з пажаданнямі для сябе і сваіх аднагодкаў.

Ну, а які ж Новы год без падарункаў, а пагранічнік без вернага сабакі? Новаспечанаму кіраўніку Навагодняй заставы кіраўнік памежнага ведамства ў якасці падарунку ўручыў шчаня лабрадора. Мабыць, гэта было ўпершыню, каб Дзед Мароз не раздаваў, а сам атрымліваў падарункі.

ЯК СПРАВЫ, ДЫЯСПАРА?

Маршруты, якія ўзбагачаюць жыццё

Мудрагелістым узорам нанесены на карту Літвы і бліжэйшых да яе краін рознакаляровыя нітачкі… Такім незвычайным спосабам ансамбль беларускай песні “Світанак”, што існуе ў горадзе Вісагінас, адзначае маршруты сваіх канцэртных паездак.

Святлана Каладзінская

Вольга Карней

Людзі, апантаныя ідэяй захаваць культурную спадчыну, звярнуліся ў беларускі цэнтр “Крок”, які дзейнічае ў Вісагінасе, з прапановай стварыць песенны калектыў. Ініцыятыва была падхоплена, і зусім хутка нарадзіўся “Світанак”. Пра яго першыя крокі, далейшыя поспехі і ўвогуле пра тое, як жывуць беларусы ў гэтым горадзе, распавядае ўдзельніца калектыву Святлана Каладзінская.

— Пачынаць было даволі няпроста: у нас не было ні песень, ні нот, ні касцюмаў. Затое — быў вялікі запал. Мы сталі ездзіць па гарадах Беларусі, збіраючы матэрыял для нашага рэпертуара. У гурта нават склалася традыцыя — наведваць родныя мясціны яго ўдзельнікаў. Мы пабывалі ў вёсачцы Ёды Віцебскай вобласці, дзе нарадзіўся наш баяніст Міхаіл Патоба, ў Камянцы былі, у Паставах, увогуле шмат месцаў аб’ездзілі. Беларускія калектывы шчодра дзяліліся з намі песнямі, сакрэтамі выканання. А хор імя Цітовіча нават касцюмы падараваў.

Трэба сказаць, што напачатку ансамбль быў выключна песенны. Аднак з цягам часу ўдзельнікі “Світанка” зразумелі: песня без танца — бляклая, цьмяная. Таму вырашылі “аздобіць” свае выступленні танцавальнымі нумарамі. Потым пачалі інсцэніраваць басні, ставіць інтэрмедыі. Сёння рэпертуар “Світанка” даволі багаты: яго канцэрт можа доўжыцца больш за гадзіну.

— У вас ўжо было нямала выступленняў. Дзе ансамбль сустракалі асабліва цёпла?

— Беларусаў прымаюць усюды добра. Штогод мы ўдзельнічаем у святах беларускай песні, якія ладзяцца у розных гарадах Літвы. У 2005 годзе такое свята праходзіла ў Вісагінасе. Выступалі ў Латвіі, Эстоніі, Венгрыі, у Скандынавію наведваліся. Ведаеце, два гады таму “Світанак” быў запрошаны на этнафестываль у Швецыю. Ніколі не забуду, якую цікавасць да нас тады праявілі: з якім здзіўленнем глядзелі на цымбалы, з якім захапленнем мацалі нашы касцюмы. Асаблівы фурор выклікала вопратка, расшытая пацеркамі: шведы разглядалі кожны ўзор, захапляючыся ювелірнай працай беларускіх майстрых.

Не абмінаем і родную Беларусь. У нас склаліся сяброўскія адносіны з ансамблем “Паазер’е” з Пастаў, які штогод запрашае нас на музычнае свята “Звіняць цымбалы і гармонік”. Удзельнічалі ў святкаванні Дзён беларускай пісьменнасці ў Камянцы. Адразу ўсіх паездак і не прыгадаеш. Трэба прызнацца: выступаць у Беларусі хоць і прыемна, але складана. Мясцовая публіка не раз бачыла сапраўды прафесійныя калектывы. Таму, выходзячы на сцэну, мы заўсёды хвалюемся: ці спадабаецца наш канцэрт, ці ўзрушыць ён землякоў? І, калі напрыканцы выступлення гучаць апладысменты, мы адчуваем асалоду, якая ўдвая, а то і ўтрая большая за тую, якую мы зведваем за мяжой.

— Ці часта збіраюцца беларусы ў Вісагінасе?

— Удзельнікі “Світанка” сустракаюцца два разы ў тыдзень на рэпетыцыях. Акрамя таго, бачымся на святах. Самае цудоўнае, на мой погляд, — гэта Купалле. Адзначаем яго ў лепшых традыцыях нашых продкаў: выязджаем на маляўнічыя азёры, водзім карагоды, палім вогнішчы, спяваем усю ноч. Часта да нас далучаюцца іншыя беларускія калектывы, што існуюць у Літве. Атрымліваецца насамрэч дзівоснае свята.

— Калі сустракаецеся, на якой мове размаўляеце?

— Імкнемся на беларускай. Бывае, канешне, праскочыць слова па-літоўску: усё ж не адзін дзень тут жывем. Я, напрыклад, пераехала ў Вісагінас трыццаць гадоў таму. Моладзь заахвочваем вывучаць мову бацькоў: заняткі праводзяцца ў цэнтры “Крок”, у школе ёсць факультатывы. Выкладаюць у “Кроку” і гісторыю Беларусі, рыхтуюць выпускнікоў да паступлення ў беларускія навучальныя ўстановы.

— Акрамя гастроляў са “Світанкам”, ці часта самі прыязджаеце на радзіму?

— Так, наведваюся да родных у Віцебскую вобласць. Вельмі люблю бываць у Мінску. Не магу не адзначыць, якім прыгожым стаў горад. У Вісагінасе, калі глядзім беларускія навіны, шмат чуем пра смелыя праекты будаўнікоў. Нядаўна давялося пабачыць сёе-тое на свае вочы: пабывала ў Нацыянальнай бібліятэцы і падземным гандлёвым цэнтры “Сталіца”. Вярнулася ў Вісагінас і не стамлялася расказваць, як па-сучаснаму, як мадэрнова ўсё зроблена!

Ансамбль “Світанак” з Вісагінаса часта наведвае Беларусь

Верагоднасць — катэгорыя навуковая

У Беларусі ёсць перспектывы знайсці прамысловыя алмазы

Іван Цыганкоў

Пошукі алмазаў у Беларусі вядуцца ўжо каля васьмі гадоў. У мінулым годзе на тэрыторыі рэспублікі знойдзена больш за дваццаць магнітных анамалій, якія сведчаць аб магчымай наяўнасці алмазаў. Зараз вучоныя праводзяць іх даследаванне.

Дырэктар Інстытута геахіміі і геафізікі Нацыянальнай акадэміі навук Анатоль Махнач адзначыў, што сведчаннем наяўнасці алмазаў у складзе зямной кары можа стаць выяўленне двух тыпаў парод — кімберліту і лампроіту. “Раней мы не знаходзілі гэтых парод, аднак у апошні час з’явіліся прыкметы іх наяўнасці на тэрыторыі рэспублікі”, — сказаў ён. Верагоднасць выяўлення прамысловых месцараджэнняў алмазаў значна ўзрасла.

Тэрыторыя, на якой размешчана Беларусь, пакрыта вялікай тоўшчай пяску і гліны, якія ўскладняюць доступ да іншых выкапняў, размешчаных глыбей. Аднак беларускія вучоныя распрацоўваюць тэхналогіі і новыя геафізічныя метады даследавання, якія дазволяць вырашыць гэтую праблему.

Сусветны вопыт сведчыць аб тым, што са 100 абследаваных трубак выбухаў толькі адна аказваецца алмазаноснай. Тым не менш, пры яе выяўленні акупляюцца ўсе сродкі, выдаткаваныя на правядзенне пошукавых работ. Таму пошукі алмазаў мэтазгодна працягваць, лічаць беларускія вучоныя.

НАВІНЫ СУПОЛАК

Колеры творчасці

Шмат адценняў унікальных элементаў народных традыцый увабраў у сябе IV міжнародны фестываль “Вентспілскі вянок—2007”.

У свяце ўдзельнічалі дваццаць пяць калектываў і салістаў, якія прадстаўлялі адзінаццаць нацыянальных культур, у тым ліку латышскую, літоўскую, беларускую, рускую, украінскую, татарскую і башкірскую, румынскую, малдаўскую і яўрэйскую.

З усёй Латвіі з’ехаліся ў горад на Венце калектывы і асобныя выканаўцы. “Вентспілскі вянок” яшчэ раз праявіўся як фестываль наватарскі. І ў плане не толькі тэхнічных сродкаў, але і мастацкіх форм. Відовішчным і непаўторным быў гала-канцэрт у алімпійскім комплексе “Вентспілс”. Арганізатары змаглі ўсё наладзіць такім чынам, што выступленне прайшло на адным дыханні.

“Вентспілскі вянок” — фестываль міжнародны. На гэты раз у ім прымала ўдзел сямейнае трыо “Ваакс” з Магілёўскай вобласці. Гэты калектыў выступіў не толькі на гала-канцэрце, але і парадаваў вентспілчан на другі дзень асобным канцэртам у гарадскім цэнтры культуры.

Вентспілс, Латвія

Роздум пра традыцыі

Беларусы Іркуцка адзначылі Дзень памяці продкаў — Дзяды.

Вось што расказаў старшыня Таварыства беларускай культуры імя Я. Чэрскага Алег Рудакоў:

“Мы зрабілі ўтульны вечар. Прагучалі некалькі песняў, потым Вольга Галанава выступіла з аповедам пра вядомых беларускіх дзеячаў-юбіляраў. Акрамя таго, прагучаў філасофскі роздум пра гісторыю і традыцыі Дзядоў.

Мы накрылі стол — спачатку саломай, потым абрусамі. Вячэра складалася з трох абавязковых страваў — кукці, бліноў, кісялю — з таго, чым нашая хата багатая”.

Іркуцк

У культурным асяроддзі

У Расіі дзейнічаюць больш за пяцьдзесят фальклорных беларускіх калектываў.

У асноўным удзельнікі гэтых калектываў — беларусы, якія пражываюць на тэрыторыі Расіі. Але не толькі. Народная творчасць уяўляецца цікавай і для расіян.

Упершыню мінулым летам ў Маскве прайшоў фестываль аматарскіх беларускіх калектываў. Ён стаў прыкметнай з’явай у культурным жыцці дзвюх дзяржаў. Свята плануецца праводзіць і ў будучым.

Ёсць таксама актыўнасць і ў развіцці руху пародненых гарадоў. Партнёрскія сувязі, у прыватнасці, устаноўлены паміж 30 гарадамі Падмаскоўя і Беларусі.

Расія

Каб сям'я была шчаслівай

Падрыхтавацца да будучага мацярынства і бацькоўства дапаможа Цэнтр перспектыўнага дзяцінства Беларускага дзяржаўнага універсітэта.

Плануецца, што ў новым структурным падраздзяленні універсітэта пры падтрымцы Дзіцячага фонду ААН у Рэспубліцы Беларусь будзе ажыццяўляцца праект міжнароднай тэхнічнай дапамогі "Стварэнне мадэлі фарміравання ўсвядомленага бацькоўства". Праект прадугледжвае правядзенне сацыялагічных апытанняў студэнтаў, семінараў-трэнінгаў, факультатываў, круглых сталоў, дыспутаў, выданне буклетаў, брашур, дапаможнікаў, а таксама газеты "Шчаслівая сям'я". У хуткім будучым у цэнтры будзе распрацаваны і свой спецыялізаваны сайт.

Цэнтр плануе супрацоўнічаць з факультэтамі БДУ, іншымі універсітэтамі, міністэрствамі, ведамствамі і грамадскімі арганізацыямі. А ўжо ў красавіку пройдзе першы міжнародны круглы стол, у рабоце якога прымуць удзел прадстаўнікі розных айчынных і замежных арганізацый.

ЛЁС

Вяртанне з забыцця

На Пастаўшчыне завяршыўся год мастака Альфрэда Ромера

Генуэфа Дубіловіч

Ён быў прадстаўніком старажытнага нямецкага дваранскага роду. Многія Ромеры жылі ў XIX стагоддзі на беларускіх і літоўскіх землях, пусцілі тут глыбокія карэнні, унеслі значны ўклад у мясцовую культуру і таму ўспрымаліся, як свае. Аднак праходзіў час, змяняліся ўлады — і сляды, пакінутыя гэтымі асветнікамі, сціраліся з памяці.

Яшчэ гадоў пяць назад мы, парафіяне Камайскага касцёла, пабудаванага ў 1603—1606 гадах, нават не падазравалі, што выдатны мастак, скульптар, этнограф, культурны і грамадскі дзеяч, удзельнік паўстання супраць царскіх уладаў і палітычны ссыльны Альфрэд Ромер (1832—1897) жыў і памёр у суседнім з Камаямі Каралінове, што ў нашым касцёле вісіць яго слынны абраз "Хрыстос і сірата" — адзін з двух яго твораў, якія захаваліся ў Беларусі (у Пінску знаходзіцца "Мадонна ў промні"). Астатнія яго палотны і гравюры трапілі ў музеі Варшавы, Кракава, Вільні. Многа намаганняў для ўзнаўлення памяці пра напаўзабытага майстра зрабіў мінскі мастак Алесь Цыркуноў, які часта ў нас бывае. Дзякуючы яго стараннням імя Альфрэда Ромера было прысвоена Пастаўскай дзіцячай мастацкай школе, а сядзібе ў Каралінове прыдадзены статус гісторыка-культурнай каштоўнасці.

Асвяшчэнне дошкі ў гонар А.Ромера

І вось па ініцыятыве камайскага ксяндза Яцэка Хутмана сёлетні год, калі споўніліся круглыя даты з дня нараджэння і смерці нашага земляка, быў абвешчаны годам памяці Альфрэда Ромера. Спачатку — у парафіі, а потым ініцыятыва распаўсюдзілася на ўвесь раён і нават шырэй. Газета "Голас Радзімы" пісала ўжо пра вечар, прысвечаны мастаку, які адбыўся вясной у Мінску, у Доме-музеі Валянціна Ваньковіча. У Каралінова і Камаі прыязджаў нават міністр культуры Германіі. У розных ракурсах ён фатаграфаваў абраз "Хрыстос і сірата", даў яму высокую ацэнку як твору мастацтва.

А ў адну з лістападаўскіх нядзеляў касцёл у Камаях запоўнілі вернікі і госці. Сярод іх былі прадстаўнікі мясцовых і раённых уладаў. Старшыня грамадскай Рады па ўшанаванню памяці А. Ромера Алесь Цыркуноў гаварыў аб тым, што трэба аднавіць сядзібу ў Каралінове, стварыць там музей і ўжо цяпер пачаць у наваколлі збіранне старых рэчаў, якія могуць стаць экспанатамі. Пастаўскі паэт Аркадзь Нафрановіч прадэкламаваў свой верш, прысвечаны мастаку. Аптымістычна прагучаў апошні радок: "Ягонай зорцы век гарэць на беларускім небасхіле". Было абвешчана, што адна з новых вуліц Камаяў (сёння гэта агрэгарадок) названа імем Ромера.

Кульмінацыяй жа ўрачыстасці стала асвячэнне мемарыяльнай дошкі ў гонар Альфрэда Ромера.

Такая прырода не можа не зачароўваць сваёй прыгажосцю

Па запаветных сэрцу мясцінах

У Бярэзінскім біясферным запаведніку адкрылася адзіная ў СНД тэматычная экспазіцыя

Валерыя Снегава

Матэрыялы гісторыка-дакументальнай выставы расказваюць аб запаведнай справе ў Беларусі і Расіі пачынаючы з канца XIX стагоддзя і да нашых дзён. Сярод экспанатаў ёсць унікальныя здымкі царскага паляванння ў Белавежскай пушчы, копіі сакрэтных дакументаў аб ліквідацыі Бярэзінскага біясфернага запаведніка і аб узнаўленні яго дзейнасці. Экскурсантам будзе цікава ўбачыць і абсталяванне, з дапамогай якога ў 60-70-х гадах мінулага стагоддзя вёўся нагляд за ахоўнымі тэрыторыямі.

У падрыхтоўцы выставы прымалі ўдзел беларускія і расійскія рэгіянальныя архівы, прыродаахоўныя ведамствы, Бярэзінскі біясферны запаведнік і Нацыянальны парк "Белавежская пушча", расійскі ваенна-гістарычны архіў і архіў кінафотадакументаў Расійскай Федэрацыі. Праект задумваўся як разавы — выстава дэманстравалася ў Маскве ў 2006 годзе. Аднак яна выклікала вялікую цікавасць, і экспазіцыю вырашана было зрабіць пастаяннай, размясціўшы ў Бярэзінскім біясферным запаведніку. Работа над папаўненнем фондаў будзе працягвацца.

А пакуль архівісты шукаюць новыя дакументы, выстава стала яшчэ адным пунктам у экскурсійным маршруце па Бярэзінскаму запаведніку. Турысты зараз могуць пазнаёміцца не толькі з музеем прыроды, прайсціся па экалагічнай сцяжыне, але і даведацца аб тым, як ахоўваюцца запаведнікі.

Камендант Масквы Кузьма Сінілаў

Ураджэнец Лоеўшчыны прайшоў складаны, але цікавы і багаты на падзеі жыццёвы шлях

Вольга Антановіч

Кузьма Раманавіч Сінілаў. Усё сваё жыццё гэты чалавек верна служыў народу. Далёкаму Усходу, Маскве прасвяціў сябе ўсяго. А сам быў родам з Беларусі, з вёскі Бывалькі Рэчыцкага павета Мінскай губерні (цяпер Лоеўскі раён Гомельскай вобласці). Нарадзіўся 14 мая 1902 года ў сялянскай сям'і. У семнаццацігадовым узросце ўступіў без ваганняў у Чырвоную Армію. За выдатную службу накіравалі яго ў часці асобага прызначэння.

Неўзабаве пасля грамадзянскай вайны Кузьма Сінілаў атрымаў загад — на Далёкі Усход, камандзірам кавалерыйскай брыгады, што дыслацыравалася ў раёне Спаска–Дальняга. У 25 гадоў даслужыўся да камандзіра эскадрона.

У Прымор'і наш зямляк знайшоў і сваё асабістае шчасце. На адным з канцэртаў мастацкай самадзейнасці (Кузьма Сінілаў быў па сумяшчальніцтву яшчэ і кіраўніком Дома культуры Спаскага гарнізона) у маладога і прыгожага камандзіра з першага позірку закахалася юная спявачка Раіса Бондар. Згулялі хутка вяселле. У 1926 годзе ў шчаслівай сямейнай пары нарадзілася дачка Нінэль. Потым лёс падараваў Сінілавым яшчэ дачку Галю і хлопчыкаў-блізнят Косцю і Алёшу.

Кузьма Сінілаў. З архіва яго сына Канстанціна

У 1929 годзе, у час падзей на кітайскай ваеннай чыгунцы, дзеянні кавалерыстаў атрымалі самую высокую ацэнку камандавання. Сам Блюхер прадставіў Кузьму Сінілава да ўзнагароды: ён увайшоў у залатую сотню ўладальнікаў ордэна Чырвонага Сцяга.

У 1933 годзе ён стаў слухачом ваеннай акадэміі імя Фрунзе, якую скончыў з дыпломам першай ступені. З другой паловы 30-х гадоў камандаваў рознымі пагранічнымі атрадамі ў Забайкаллі. А ў 1939 годзе быў прызначаны камандзірам упраўлення пагранвойскаў Мурманскай акругі НКУС, часцям якой давялося ўдзельнічаць у баявых дзеяннях фінскай кампаніі. Затым Сінілаў залічваецца слухачом Акадэміі Генштаба. Аднак навучанне прыйшлося перапыніць: у верасні 1941 года ён прыняў 2-ую мотастралковую дывізію НКУС Масквы.

Нечакана новапрызначанага генерал-маёра вызвалі ў Крэмль. Хутка ў пастанаўленні Дзяржаўнага камітэта Абароны гаварылася аб тым, што сталіца абвяшчаецца на асадным становішчы, яе абарона даручаецца генералу Жукаву, а ахова парадку ў горадзе і бліжэйшых раёнах ускладаецца на каменданта Масквы генерал-маёра Сінілава.

Ваенны камендант быў распарадчым, вельмі аўтарытэтным. Нельга сказаць, што Сінілаў быў чалавекам, запраграміраваным толькі выконваць распараджэнні. Ён быў таленавітай і інтэлектуальнай асобай. У пасляваенныя гады ўзначальваў Усесаюзную федэрацыю класічнай барацьбы, быў апекуном шахматыстаў. А яшчэ Сінілаў меў цудоўны голас, валодаў рэдкім тэнарам. Сам Іван Казлоўскі аднойчы прапанаваў Кузьме Раманавічу праспяваць партыю.

Трапіўшы пасля вайны ў Краснаярск, Кузьма Сінілаў выкладаў на ваеннай кафедры мясцовага лесатэхнічнага інстытута. Потым — загадваў такімі кафедрамі ў Разанскім сельскагаспадарчым інстытуце, у Маскоўскім эканамічна-статыстычным інстытуце.

Памяць пра Кузьму Сінілава зберагаюць на Далёкім Усходзе. Яму, у прыватнасці, прысвечаны стэнд у музеі Спаска-Дальняга.

Адмысловы рэнесанс

Ганна Бандарчук

Віцебскія Саляныя сховішчы XVII стагоддзя ўключаны ў турыстычны маршрут па старажытнаму гораду.

Турыстычную прывабнасць аб'екту створаць не толькі яго архітэктурная унікальнасць і гісторыя. Узведзеныя ў 1774 годзе на беразе Заходняй Дзвіны Саляныя сховішчы прызначаліся для захавання стратэгічнага запасу зерня, мукі і солі. Комплекс складаўся з трох будынкаў: цэнтральнага і двух бакавых, размешчаных франтальна і злучаных аркамі. Да нашых дзён захаваліся толькі два будынкі — цэнтральны і правы бакавы з аркамі і пілястрамі. У пасляваенныя гады тут захоўваўся армейскі правіянт.

Сёння помнік гісторыі стаў домам для Цэнтра народных рамёстваў "Задзвінне", які аб'яднаў некалькі дзесяткаў майстроў дэкаратыўна-прыкладнага мастацтва і артыстаў узорнага ансамбля "Жалейка". Акрамя таго, у Саляных сховішчах з'явілася сучасная выставачная зала і кафэ нацыянальнай кухні. Наведвальнікі цэнтра змогуць сваімі рукамі пад кіраўніцтвам вопытных рамеснікаў вылепіць на памяць гаршчок, сплесці кветку з саломкі. Цэнтр ужо працуе над стварэннем забаўляльнай праграмы для турыстаў, а турфірмы ўносяць яго ў свае маршруты.

Рэстаўрацыя Саляных сховішчаў была ўключана ў інвестыцыйную праграму Міністэрства культуры. Першая чарга сховішчаў была ўведзена ў строй у мінулым годзе. Аднак са здачай у эксплуатацыю другой чаргі рэканструкцыя турыстычнага аб'екта не закончыцца. Працягнецца добраўпарадкаванне набярэжнай, пачнецца рэканструкцыя доміка пад кавальскую майстэрню, а ганчары будуць прама на вуліцы ляпіць і апальваць збаны.

Віцебскія Саляныя сховішчы XVII стагоддзя адкрыты для турыстаў

У кантэксце дыялогу

Ірына Цімафеева

Выстава "Беларусь-Латвія: гістарычны, навуковы і культурны дыялог" праходзіць у Латвійскай акадэмічнай бібліятэцы. На ёй прадстаўлена больш за трыста экспанатаў з архіўных фондаў бібліятэкі, прысвечаных культурным і навукова-гістарычным сувязям дзвюх краін.

На выставе можна ўбачыць таксама фотаматэрыялы з экспедыцый прафесара Яніны Курсітэ па тэрыторыі Беларусі ў пошуках месцаў пражывання латышоў у прыгранічных рэгіёнах. У калекцыі Латвійскай акадэмічнай бібліятэкі ёсць шмат цікавых выданняў аб Беларусі, манаграфіі беларускіх вучоных, літаратурныя выданні, мастацкія альбомы, праграмы тэатральных выстаў, фатаграфіі і іншыя матэрыялы.

Варта адзначыць, што паміж дзвюма суседнімі дзяржавамі склаліся адносіны, якія развіваліся і ўдасканальваліся на працягу стагоддзяў. Беларусы з'яўляюцца трэцяй па колькасці нацыянальнасцю, якая пражывае ў Латвіі. Для захавання ідэнтычнасці і этнічнай прыналежнасці дзейнічаюць культурныя таварыствы і Беларуская асноўная школа ў Рызе.

Масавы ад'езд латышоў у Беларусь пачаўся яшчэ прыблізна ў 1870 годзе, калі ў "Majas Viesis" і іншых перыядычных выданнях публікаваліся абвяшчэнні аб выгодных умовах арэнды і пакупкі зямлі. Будаваліся школы і цэрквы, ствараліся аматарскія тэатры, сумесна адзначаліся святы. На тэрыторыі Беларусі нарадзіліся, вучыліся і пражывалі многія выдатныя дзеячы культуры, навукі і ваенныя Латвіі — пісьменнікі Вераніка Янелсіня і Эдуард Саленіекс, філолаг Пецерыс Кікаука, выдатны палкоўнік Фрыдрых Брыедыс, а паэт Фрыцыс Брыўземніекс вучыўся ў школе ў Магілёўскай вобласці.

Месца для рарытэтаў

Дзіяна Грышанава

У Гомелі ствараецца музей аўтамабіляў пад адкрытым небам

Арганізатары плануюць размясціць у музеі найбольш цікавыя мадэлі аўтатранспарту, у тым ліку і рарытэтныя. Як паведаміў галоўны спецыяліст па захаванню гісторыка-культурнай спадчыны ўпраўлення культуры Гомельскага аблвыканкама Сяргей Разанаў, стварэнне музея прадугледжана рэгіянальнай праграмай развіцця музейных устаноў у 2007-2010 гадах. Ужо знойдзены ўчастак, дзе размесціцца музей-выстава тэхнікі: на тэрыторыі Савецкага раёна горада. Спачатку падборам экспанатаў будуць займацца аўтатранспартныя прадпрыемствы вобласці. Паралельна плануецца прыцягнуць да стварэння музея і прыватных асоб — уладальнікаў рэдкіх аўтамабіляў.

КРЫЖАВАНКА

У навагоднім адлюстраванні

Па гарызанталі:

2. «Хто нам скажа, хто згадае,/ Чым нас Новы … спаткае/ І парадуе нас чым?" (З верша Я. Коласа). 3. Вершаваная страфа з чатырох радкоў. 5. Прысвятак у беларускім народным календары, які адзначаўся 17 сакавіка па старому стылю. 8. … не конь: не падгоніш і не прыпыніш (прык.). 11. Вясновы месяц. 12. Маладзік рогі задраў — на моцны … (прык.). 13. "Кінем покліч гулказвонны/ Ад аконца да аконца,/ Свет паклічам мёртвасонны/ Аж да …, аж да …! (з верша Я. Купалы). 14. Беларускі хлопец, што касіў канюшыну. 16. Якая справа, такая і … (прык.). 19. Лірычны верш з 14 радкоў. 22. Імя дзяўчынкі з казкі Г.-Х. Андэрсэна "Снежная каралева". 24. Каталіцкі храм. 26. На .. пайшла зіма да ракі (прык.). "Дзень добры, Новы год! Будзь ласкаў,/ Заходзь у хату, сядзь за стол./ І … будзе і кілбаска,/ Бо ты наш госць і наш пасол". (з верш Я. Коласа). 30. Знак Задыяка. 31. Любімае месца адпачынку дзяцей у зімовы час. 35. Тое, што ўпрыгожвае што-небудзь. 36. Моцны высокаякасны напой. 38. Тое, што марыць кожны з нас атрымаць на Новы год. 39. Казачны персанаж, казачнік.

Па вертыкалі:

1. Верхавіна ўпрыгожанай навагодняй ёлкі. 3. Дробны лёд або снег на паверхні вады перад замярзаннем вадаёма. 4. "… белы мёртва сцелецца/ Пасцеляй грабавой,/ Сапе, шуміць мяцеліца,/ Мяце…, як мятлой". (З верша Я. Купалы). 6. Кураня-… Смачнае блюда. 7. Свята беларускага народнага календара, якое адзначаецца 11 лістапада. 9. … Паазерскі. Пастаўскі Дзед-Мароз. 10. "Мне воўк і мядзведзь у паслугах,/ Мне служаць вавёрка і …"(З верша Я. Купалы). 15. Знак Задыяка. 17. "Замялі дарогі ветрыкі снягамі./ …, як дзед убогі з доўгімі вусамі". (З верша Я. Купалы). 18. Кароткае паведамленне ў СМІ. 19. Каляднае дрэва ў некаторых краінах Скандынавіі. 20. Прадукты харчавання. 21. Металічнае пакрыццё паверхні абразоў. 23. "Здароў, марозны, звонкі вечар!" (Верш М. Багдановіча). 25. Левы прыток Свіслачы на тэрыторыі Мінскага раёна. 27. Зліталаўся … над жабаю ды й вочы выдраў (прык.). 29. Маска-персанаж у старажытным калядным абрадзе. 32. Дугападобнае перакрыцце праёма ў сцяне. 33. На лёд загрымела, будзе … (прык.). 34. Халодная закуска. 37. Ільдзіна на рацэ, на моры.

Адказы на крыжаванку

Па гарызанталі:
2. Той. 3. Станс. 5. Аднасеій. 8. Час. 11. Май. 12. Мароз. 13. Соната. 14. Ясь. 16. Слава. 19. Санет. 22. Гердз. 24. Касцёл. 26. Сарэкі. 28. Чарка. 30. Дзева. 31. Каток. 35. Адмова. 36. Страка. 38. Падарунак. 39. Баян.

Па вертыкалі:
1. Зорачка. 3. Сала. 4. Снег. 6. Тадака. 7. Мадзін. 9. Зюзя. 10. Лось. 15. Стрэлец. 17. Лес. 18. Адгадк. 19. Сасна. 20. Ежа. 21. Аклад. 23. Зімой. 25. Ліна. 27. Рак. 29. Каза. 32. Арка. 33. Холад. 34. Сальт. 37. Крыга.

У выставачнай зале — адчуванне Калядаў

Своеасаблівы калядны падарунак падрыхтавалі жыхарам і гасцям сталіцы студэнты і супрацоўнікі Беларускага дзяржаўнага універсітэта культуры.

У чарговы раз у мастацкай галерэі "Універсітэт культуры" заззяла "Калядная зорка". Так называецца выстава, якая стала заключным акордам фестывалю духоўнай музыкі і народнай творчасці.

Добры настрой наведвальнікам галерэі ствараюць прыгажуня-ёлка, святочная атмасфера і, канешне ж, цікавыя экспанаты. Акцэнт сёлетняй "Каляднай зоркі" — нацыянальная спадчына ў сучасным творчым асэнсаванні. На выставе экспануецца звыш ста эксперыментальных работ студэнтаў і выкладчыкаў кафедры дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва, у якіх выкарыстаны традыцыйныя для рэчаў матэрыялы, а вось прыёмы формаўтварэння дэкору вельмі арыгінальныя. А ўбачыць тут можна вырабы з керамікі, тканіны, габелена, узоры саломапляцення, выцінанкі, роспісу па дрэве.

Заснавальнік: Рэдакцыя газеты «СБ»
Рэдактар Віктар Харкоў
Адрас: пр. Незалежнасці, 44, Мінск, 220005
Тэлефон рэдакцыі: +375 17 288—12—80; факс: +375 17 288—12—80
Бюро па рэкламе: Тэл. +375 17 290—60—11
E—mail: golas_radzimy@tut.by
Газета надрукавана ў Рэспубліканскім унітарным прадпрыемстве «Выдавецтва «Беларускі Дом друку»
Аб'ём выдання: 1 друк. арк.
Тыраж: 2000
Заказ: 1433
Пазіцыі рэдакцыі і аўтараў, матэрыялы якіх друкуюцца на старонках "Голасу Радзімы", могуць не супадаць.
© "Голас Радзімы", 2007